**Васіль СТАРЫЧОНАК**

# ФАНЕТЫЧНЫ АНАЛІЗ

Асноўнай мэтай фанетычнага аналізу з’яўляецца ўстанаўленне дакладнай колькасці складоў, гукаў і літар у слове, вызначэнне націску і кароткая характарыстыка гукаў. Запісы пры фанетычным разборы ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з **фанетычнай транскрыпцыяй** (лац. *transcriptio* ‘перапісванне’) — сістэмай пісьма, якая выкарыстоўваецца для дакладнай передачы гукавога складу слоў якой-небудзь мовы ці яе дыялекту. Кожны гук у транскрыпцыі абазначаецца асобным знакам.

У фанетычнай транскрыпцыі беларускай мовы выкарыстоўваецца большасць літар беларускага алфавіта (акрамя *е, ё, ю, я, ь*), а таксама дадатковыя літары з лацінскага алфавіта і спецыяльныя надрадковыя значкі.

Для абазначэння **галосных** гукаў выкарыстоўваюцца літары *а, о, у, і, ы, э*. У ненаціскным становішчы галосныя [о], [э] пасля цвёрдых зычных вымаўляюцца як [а]: *[бор] — [баравы́], [ко́лас] — [каласы́], [рэ́чка] — [рачны́]*. На месцы [о], [э] пасля мяккіх зычных у першым складзе перад націскам вымаўляецца гук [а], які на пісьме абазначаецца літарай *я: [в’о́сны] — [в’асна́], [дз’энь] — [дз’ан’о́к]*. Правілу якання падпарадкоўваецца вымаўленне часціцы *не* і прыназоўніка *без*: [а] вымаўляецца перад словам з націскам на першым складзе. Напрыклад: *не ведаю — [н’а в’э́дају], без рэчаў — [б’аз рэ́чаў], але: не сустрэліся — [н’э сустрэ́л’іс’а], без аглядкі — [б’эз агл’а́тк’і]*.

Абітурыенты і школьнікі часта робяць памылкі пры фанетычным запісе галосных [і], [ы]. Не трэба забываць, што націскны [і] у пачатку слова, пасля галоснага, апострафа і раздзяляльнага мяккага знака вымаўляецца ў спалучэнні з [j]: *іскра — [jі́скра], да іх — [да jі́х], ручаіна — [ручаjі́на], аб’іньваць — [абjі́н’вац’], Ільіч — [іл’jі́ч]*. Пасля цвёрдых зычных (акрамя [г], [к], [х]) на стыку слоў і марфем зычны [і] змяняецца на [ы]: *ён ішоў —*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*[јон ышо́ў], дом і сад — [до́м ы са́т], педінстытут — [п’эдынстыту́т],* але: *Мінск і Гомель — [м’інск і гомел’], смех і грэх — [с’м’э́х і грэ́х].*

Літары *е, ё, ю, я* абазначаюць адпаведна гукі [э], [о], [у], [а] і мяккасць папярэдняга зычнага: *песня — [п’э́с’н’а], вянок — [в’ано́к], лёд — [л’от], сцюжа — [с’ц’у́жа].* Гэтыя ж літары ў пачатку слова, пасля галоснай у сярэдзіне ці на канцы слова, а таксама пасля раздзяляльнага мяккага знака, апострафа і зычнага *ў* абазначаюць два гукі: е →[јэ], ё → [јо], ю→ [ју], я → [ја]: *ясны — [јасны], ёлка — [јолка], твае — [твајэ], устаю — [устају], мільён — [м’іл’јон], сям’я — [с’амја], з‘езд — [з’јэ́ст], здароўе — [здароўјэ].*

**Зычныя** гукі абазначаюцца адпаведнымі літарамі беларускага алфавіта. Гукі [дз] і [дж] могуць абазначацца двума спосабамі — спалучэннем літар *дж* і *дз* з надрадковым знакам, які ўказвае на іх злітнае вымаўленне, а таксама лацінскімі літарамі z (для *дз*) і **ž**(для *дж*): *[z’і́ва] і [дз’і́ва], [z’а́кавац’] і [дз’а́ кавац’], [даж**ž**ы] і [дождж́ы], [**ž**а́ла] і [джа́ла].*

Фрыкатыўны (шчылінны) гук [г] перадаецца літарай *г* беларускага алфавіта ці грэчаскай літарай γ (гама): *[гаво́рка] і [γаво́рка], [гл’эй] і [γл’эй], [нага́] і [наγа́].* Выбухны [г] часцей абазначацца літарай *г*, радзей — літарай *g : [га́нак], і [gа́нак], [гу́з’ік] і [gу́з’ік].* Гук [й] у пачатку склада і перад галоснымі абазначаецца лацінскай літарай *j*, а ў астатніх выпадках — літарай *й*: [јаго́], [гі’сто́рыја] [ма́йск’і], [дайс’ц’і́], [найп’э́ршы].

Пры запісе тэкста ў транскрыпцыі і пры фанетычным аналізе неабходна дакладна перадаваць вымаўленне гукаў, якія могуць змяняць сваю якасць у залежнасці ад характару ўплыву суседніх гукаў і ад становішча ў слове (у пачатку, сярэдзіне, канцы). Асноўныя змены зычных гукаў прыводзяцца ў наступнай табліцы:

| З ы ч н ы я г у к і | |
|---|---|
| 1. *Звонкія* | аглушаюцца ў сярэдзіне слова перад глухімі і на канцы слова: *з-пад снегу — [с пат сн’э́гу], парог — [паро́х], бераг — [б’э́рах], сцежка — [с’ц’э́шка], дуб — [дуп]* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| 2. *Глухія* | азванчаюцца перад звонкімі: *барацьба — [барадз’ба́], нось-* |
| <br>3. *Шыпячыя* | *біт — [но́з‘б’іт], футбол — [фудбо́л], просьба — [про́з’ба]*<br>прыпадабняюцца да наступных свісцячых: на кладачцы — |
| <br><br>4.*Свісцячыя* | *[на кла́дацы], на дошцы — [на до́сцы], сустрэнешся — [сустрэн’эс’а]*<br>прыпадабняюцца да наступных шыпячых: зжаць — *[жац’],* |
| <br><br>5. *Цвёрдыя* | *сшытак — [шы́так], пясчаны — [п’ашча́ны], перавозчык — [п’эраво́шчык]*<br>змякчаюцца перад мяккімі зычнымі: *снег — [с’н’эх], свет* |
| *свісцячыя з і с*<br><br><br><br>6. *Зычныя* | *— [с’в’эт],песня — [п’э́с’н’а], смятана — [с’м’ата́на], збіць — [з’б’іц’], з’ехаць — [з’јэ́хац’].* Не адбываецца змякчэння перад *г, к, х*: *разгінаць — [разг’інац’], скінуць — [ск’інуц’], схема — [сх’эма],схіліцца —[сх’іл’і́ца]*<br>перад мяккімі [в’] і [м’] вымаўляюцца як [дз’] і [ц’]: *дзверы —* |
| | |
| *д і т* | *[дз’в’э́ры], подзвіг — [по́дз’в’іх], чацвёрты —* |
| | *— [чац’в’о́рты], цвёрды — [ц’в’о́рды]* |
| 7. *Спалучэнне* | вымаўляецца як *[ц]: шведскі —[шв’э́цк’і], грамадскі —* |
| *дс*<br>8. *Спалучэнні* | *[грама́цк’і]*<br>вымаўляюцца як падоўжаны [ч]: *спадчына — [спа́чына],* |
| *дч, тч*<br><br>9. *Спалучэнні* | *адчуваць — [ачува́ц’], разведчык — [раз’в’э́чык], пераплёт-чык — [п’эрапл’о́чык], падчарка — [па́чарка]*<br>вымаўляюцца як падоўжаны [ц]: *на вокладцы — [на* |
| *дц, тц*<br><br>10. *Спалучэнні* | *во́клацы], у вопратцы — [у во́працы], ля карытца — [л’а кары́ца]*<br>вымаўляюцца як [шч]: *расказчык — [раска́шчык], возчык —* |
| *зч, сч*<br><br>11. *Спалучэнне* | *[во́шчык], грузчык — [гру́шчык], перапісчык — [п’эрап’і́шчык]*<br>вымаўляецца як [ск]: *абхазскі — [апха́ск’і], французскі —* |
| *зск* | *[францу́ск’і], каўказскі — [каўка́ск’і]* |

Затранскрыбіраваныя спалучэнні гукаў, словы і тэксты бяруцца ў квадратныя дужкі з абавязковым абазначэннем націску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вялікія літары і знакі прыпынку (акрамя пытальніка і клічніка) не ўжываюцца.

Мяккасць зычных (палаталізацыя) передаецца знакам ( *'): [с'і/н'і], [пас'арэ/дз'ін'э], [л'н'аны/]* .

Падоўжаныя і падвоеныя зычныя абазначаюцца гарызантальнай рысай над літарай ( ): *[с'аго/н'а], [в'ас'э/л'э], [збо/жа]* .

Злітнае вымаўленне передаецца дужкай паміж літарамі ( ).

Службовыя словы вымаўляюцца злітна са знамянальнымі часцінамі мовы і ўтвараюць з імі адно **фанетычнае слова** — гукавую адзінку, аб'яднаную адным націскам: *у дзеда — [у ʒ'э/да], з лесу — [з л'э/су], пад снегам — [пат с'н'э/гам], як шкло — [јак шкло/]).*

Кароткія (непрацяглыя) паўзы абазначаюцца адной нахіленай рысай (/), працяглыя — дзвюма (//). Так, пачатак верша У. Дубоўкі "О Беларусь, мая шыпшына" у фанетычнай транскрыпцыі будзе мець наступны выгляд:

| | |
|---|---|
| *О Беларусь, мая шыпшына,* | *[о б'элару/с' / маја/ шыпшы/на /* |
| *зялёны ліст, чырвоны цвет.* | *з'ал'о/ны л'і/ст / чырво/ны ц'в'э/т //* |
| *У ветры дзікім не загінеш,* | *у в'э/тры дз'і/к'ім н'э заг'і/н'эш /* |
| *чарнобылем не зарасцеш* | *чарно/был'эм н'э зарас'ц'э/ш]* |

Прывядзём запіс наступных радкоў Максіма Танка ў фанетычнай транскрыпцыі:

*Пакуль не ступілася джала разца*
*І рукі ад працы не мараца,*
*Я мушу пакінуць адбітак жыцця*
*На камні, жалезе і золаце.*

*[паку/л' н'э ступ'і/лас'а **ž**а/ла расца/ /*
*і ру/к'і ат пра/цы н'а мо/раца /*
*ја му/шу пак'і/нуц' адб'і/так жыц'а/ /*
*на ка/мн'і жал'э/з'э і зо/лац'э]*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*     Фанетычны аналіз слова звычайна праводзяць у наступнай п а сл я д о ў н а с ц і:

1. Называецца колькасць складоў і націскны склад у слове.

2. Вызначаецца колькасць гукаў і літар.

4. Характарызуюцца галосныя гукі і іх суадносіны з літарамі. Указваюцца націскныя і ненаціскныя галосныя.

4. Характарызуюцца зычныя гукі і іх суадносіны з літарамі. Указваюцца звонкія і глухія, мяккія і цвёрдыя (ці зацвярдзелыя), свісцячыя і шыпячыя.

Пры выкананні фанетычнага разбору неабходна адрозніваць гукі і літары і не дапускаць іх блытаніны. Прывядзём узоры фанетычнага аналізу слоў *прыехаць, авадзень, аварыя, ёсць, мільярд, адказ, ісціна.*

*Прыехаць — [пры -jэ/ - хац']*, у слове 3 склады (націск на другім складзе), 8 літар і 8 гукаў.

п — [п] — зычны, глухі, цвёрды;

р — [р] — зычны, звонкі, санорны, зацвярдзелы;

ы— [ы] — галосны, ненаціскны№

[j] — зычны, звонкі, заўсёды мяккі;

літарай *е*;

е

[э] — галосны, націскны;

х — [х] — зычны, глухі, цвёрды, *заднеязычны, шчылінны, шумны, абазначаецца літарай х (ха);

а — [а] — галосны, ненаціскны;

ц — [ц'] — зычны, глухі, мяккі;

ь — гука не абазначае

У слове 8 літар, 8 гукаў.

*Авадзень — [а- ва- з'э/н']*, у слове 3 склады (націск на трэцім складзе), 7 літар і 6 гукаў.

а — [а] — галосны, ненаціскны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

в — [в] — зычны, звонкі, санорны, цвёрды;

а — [а] — галосны, ненацiскны;

дз —[z'] — зычны, звонкі, мяккі, свiсцячы

е — [э] — галосны, нацiскны;

н — [н'] — зычны, звонкі, санорны, мяккі;

ь — гука не абазначае

У слове 7 лiтар, 6 гукаў.

*Аварыя — [а - ва́ - ры -ja],* у слове 4 склады (нацiск на другiм складзе), 6 лiтар i 7 гукаў.

а — [а] — галосны, ненацiскны;

в — [в] — зычны, звонкі, санорны, цвёрды;

а — [а] — галосны, нацiскны;

р — [р] — зычны, звонкі, санорны, зацвярдзелы;

ы— [ы] — галосны, ненацiскны;

я — [j] — зычны, звонкі, санорны, заўсёды мяккі;
[а] — галосны, ненацiскны.;

У слове 6 лiтар, 7 гукаў.

*Ёсць — [jос'ц'],* аднаскладовае слова, 4 лiтары i 4 гукi.

ё — [j] — зычны, звонкі, санорны, заўсёды мяккі;
[о] — галосны, нацiскны,;

с — [с'] — зычны, глухi, свiсцячы, мяккі;

ц —[ц'] — зычны, глухi, мяккі, свiсцячы;

ь — гука не абазначае.

У слове 4 лiтары, 4 гукi.

*Мiльярд — [м'i — л'jа́рт]*, у слове 2 склады (нацiск на другiм складзе), 7 лiтар i 7 гукаў.

м — [м'] — зычны, звонкі, санорны, мяккі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і [ і ] — галосны, ненаціскны,;

л — [л’] — зычны, звонкі, мяккі;

ь — гука не абазначае

[j] — зычны, звонкі, санорны, заўсёды мяккі;

я

[а] —галосны, націскны;

р — [р] — зычны, звонкі, санорны, зацвярдзелы;

д — [т] — зычны, глухі, цвёрды,.

У слове 7 літар, 7 гукаў.

*Адказ — [ат - ка́с]*, у слове 2 склады (націск на другім складзе), 5 літар і 5 гукаў.

а — [а] — галосны, ненаціскны;

д — [т] — зычны, глухі, цвёрды;

к — [к] — зычны, глухі, цвёрды;

а — [а] — галосны, націскны;

з — [с] — зычны, глухі, цвёрды, свісцячы.

У слове 5 літар, 5 гукаў.

*Ісціна — [jі́ - с’ц’і - на]*, у слове 3 склады (націск на першым складзе), 6 літар і 7 гукаў.

[j] — зычны, звонкі, заўсёды мяккі;

і

[і] — галосны, націскны;

с — [с’] — зычны, глухі, мяккі, свісцячы;

ц —[ц’] — зычны, глухі, мяккі, свісцячы;

і — [і] — галосны, ненаціскны;

н — [н] — зычны, звонкі, цвёрды;

а — [а] — галосны, ненаціскны.

У слове 6 літар, 7 гукаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ***

1. Чым адрозніваюцца гукі ад літар?

2. Назавіце зычныя, якія ў беларускай мове заўсёды цвёрдыя.

3. Якія гукі абазначаюць літары *е, ё, ю, я*?

4. Як суадносяцца гукі і літары? Назавіце некалькі разыходжанняў паміж гукамі і літарамі.

5. Успомніце займеннікі, у якіх колькасць гукаў у два разы перавышае колькасць літар.

6. Прывядзіце 5 прыкладаў змены зычных гукаў пры іх вымаўленні.

7 . Якія знакі ўжываюцца ў фанетычнай транскрыпцыі?

8. Як падзяляюцца словы на склады?

***ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ЗАДАННІ***

1. Затранскрыбіруйце наступны тэксты.

За ўсё, што сёння маю,
Што даў мне мой народ:
За кут у родным краю,
За хлеб-соль без клапот, —
Я адплаціў народу,
Чым моц мая магла:
Зваў з путаў на свабоду,
Зваў з цемры да святла.

*(Янка Купала)*

Краіна мая, радасць мая,
Песня мая маладая!
Па нівах тваіх, па тваіх гаях
Сынава сэрца рыдае...

*(Пімен Панчанка)*

2. Вызначце колькасць гукаў і літар у наступных словах:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лёд, дзесяць, свае, паехалі, сям’я, насмешка, ін’екцыя, серыя, культывацыя, жыць.

3. Вызначыце, у якіх выпадках літары *е, ё, ю, я* абазначаюць мяккасць папярэдняга зычнага, а ў якіх — спалучэнні *j* з галоснымі *э, о, у, а.*

Аб’ява, герой, маёр, зямляк, месяц, яблык, дзевяць, раён, ёлка, юнацтва, сваяк, сведка, пралеска, вясна, суфлёр, вяселле, ліхадзей, пасцель, раз’яднанне.

4. Назавіце словы, у якіх словах спалучэнні літар *дз* і *дж* абазначаюць адзін гук, а ў якіх — два гукі.

Падзел, надзея, адзімаваць, адзначыць, дзед, дзядзька, адзвінець, адзнака, дзяўчына, сядзіба, падзямелле, дождж, хаджу, аджыць, паджылкі, ураджай, паджарыць, нараджаць.

5. Якія словы атрымаюцца, калі назоўнікі вымавіць [не прачытаць] у адваротным парадку.

Нарад, угар, араб, лёд, люк, код, ёд, муж, каб, дуб, куб, рог, сон.

6. Зрабіце фанетычны аналіз гаступных слоў і спалучэнняў слоў:

Звяно, зброя, адказ, дарожка, вузкі, рубеж, сціскаць, сшытак, лыжка, аддаць, брат і сястра, снег, сцежка, жняя, абскакаць, асвета, каўказскі, здароўе, грамадскі, ідылія, абцерці, насмешнік, эцюд, кораб, футбольны, не думаць, не прапусціць, іншы.

**Адказы да заданняў**

1. [за ўс’о′ / што′ с’о′н’а ма′ју /
што′ да′ў мн’э′ мо′й наро′т /
за ку′т у ро′дным кра′ју /
за хл’′э п со′л’ б’эс клапо′т //
ја атплац’і′ў наро′ду /
чым мо′ц маја′ магла′ /
зва′ў с пу′таў на свабо′ду /
зва′ў с’ ц’э′мры да с’в’атла′]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[краjі́на маjа́ / ра́дас’ц’ маjа́ /
п’э́с’н’а маjа́ маладаjа́! //
па н’і́вах тваjі́х / па тваjі́х гаjа́х /
сы́нава сэ́рца рыдаjэ]

2. [л’от] — 3 літары і 3 гукі, [дз’эс’ац’] — 7літар і 5 гукаў, [сваjэ] — 4 літары і 5 гукаў, [паjэхал’і] — 7 літар і 8 гукаў, [с’амjа] — 4 літары і 5 гукаў, [нас’м’эшка] — 8 літар і 8 гукаў, [ін’jэкцыjа] — 7 літар і 9 гукаў, [с’эрыjа] — 5 літар і 6 гукаў, [кул’тывацыjа] — 11 літар і 11 гукаў, [жыц’] — 4 літары і 3 гукі.

3. Літары *е, ё, ю, я* абазначаюць мяккасць папярэдняга галоснага ў словах *[г’эро́й], [з’амл’а́к], [м’э́с’ац], [дз’э́в’ац’] [прал’э́ска], [с’в’э́тка], [в’асна́], [суфл’о́р], [в’ас’э́л’э], [лі’хаz’э́й],[пас’ц’э́л’].* У словах *[абjа́ва],[маjо́р], [jа́блык], [раjо́н], [jо́лка], [jуна́цтва], [сваjа́к], [разjадна́н’э]* — літары *е, ё, ю, я* абазначаюць спалучэнні j з галоснымі *э, о, у, а.*

4. Спалучэнні літар *дз* і *дж* абазначаюць адзін гук: *падзел, надзея, дзед, дзядзька, дзяўчына, сядзіба, дождж, хаджу, ураджай, нараджаць.* Спалучэнні літар *дз* і *дж* абазначаюць два гукі: *адзімаваць, адзначыць, адзвінець, адзнака, падзямелле, аджыць, паджылкі, паджарыць*.

5. Нарад — таран, угар — рагу, араб — пара, лёд — толь, люк — куль, код — ток, ёд — той, муж — шум, каб — пак, дуб — пуд, куб — пук, рог — хор, сон — нос.

6. *Звяно* — [з’в’ано́] — 5 літар і 5 гукаў, *зброя* — [збро́jа] — 5 літар і 6 гукаў, *адказ* — [атка́с] — 5 літар і 5 гукаў, *дарожка*— [даро́шка] — 7 літар і 7 гукаў, *вузкі* — [ву́ск’і] — 5 літар і 5 гукаў, *рубеж* — [руб’э́ш] — 5 літар і 5 гукаў, *сціскаць* — [с’ц’іска́ц’] — 8 літар і 7 гукаў, *сшытак* — [шы́так] — 6 літар і 5 гукаў, *лыжка* — [лы́шка] — 5 літар і 5 гукаў, *аддаць* — [ада́ц’] — 6 літар і 4 гукі, , *брат і сястра* — [бра́т ы с’астра́] , *снег* — [с’н’э́х] — 4 літары і 4 гукі, *сцежка* — [с’ц’э́шка] — 6 літар і 6 гукаў, *жняя* — [жн’аjа́]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— 4 літары і 5 гукаў, *абскакаць* — [апскака/ц’] — 9 літар і 8 гукаў, *асвета* — [ас’в’э/та] — 6 літар і 6 гукаў, *каўказскі* — [каўка/ск’і] — 9 літар і 8 гукаў, *здароўе* — [здаро/ўјэ] — 7 літар і 8 гукаў, *грамадскі* —[грама/цк’і] — 9 літар і 8 гукаў, *ідылія* — [іды/л’ija] — 6 літар і 7 гукаў, *абцерці* — [апц’эрц’і] — 7 літар і 7 гукаў, *насмешнік* — [нас’м’э/шн’ік] — 9 літар і 9 гукаў, *эцюд* — [эц’у т] — 4 літары і 4 гукі, *кораб* — [ко/рап] — 5 літар і 5 гукаў, *футбольны* — [фудбо/л’ны] — 9 літар і 8 гукаў*, не думаць* — [н’а ду/мац’]*, не прапусціць* — [н’э прапус’ц’і/ц’]*, іншы* — [ji/ншы] — 4 літары, 5 гукаў .

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ